# МІНСК НА СТАРЫХ ПАШТОЎКАХ



(КАНЕЦ XIX – ПАЧАТАК XX ст.)



# МІНСК НА СТАРЫХ ПАШТОЎКАХ

(КАНЕЦ XIX — ПАЧАТАК XX ст.)

# МИНСК НА СТАРЫХ ОТКРЫТКАХ

(КОНЕЦ XIX — НАЧАЛО XX в.)

МІНСК «БЕЛАРУСЬ» 1984

Аўтар-складальнік
В. М. ЦЕЛЕШ

Рэцэнзенты
А. П. ІГНАЦЕНКА,
доктар гістарычных навук, прафесар;
А. І. МАЛЬДЗІС,
кандыдат філалагічных навук, член Саюза
пісьменнікаў БССР

М $\frac{0505040000-259}{М\ 301(05)-84}$ 182—84

© Выдавецтва «Беларусь», 1984

З кожным годам расце і прыгажэе сталіца Савецкай Беларусі горад-герой Мінск. Паяўляюцца новыя вуліцы і праспекты, растуць гмахі. За больш чым дзевяцісотгадовую гісторыю няўмольны час, войны і пажары неаднаразова мянялі аблічча горада. У гады Вялікай Айчыннай вайны Мінск быў амаль поўнасцю разбураны фашысцкімі захопнікамі. Іншы выгляд ён прыняў у выніку пасляваеннага аднаўлення. Непазнавальна змяніліся былыя ўскраіны...

Каб больш яскрава ўявіць, як вырас, змяніўся Мінск, трэба азірнуцца назад. Але як жа сучаснаму пакаленню мінчан заглянуць у мінулае свайго горада? Пра многае могуць расказаць даследаванні археолагаў, экспанаты музеяў, мемуарныя запісы і ўспаміны старажылаў, старыя гравюры і малюнкі мастакоў. Некаторае ўяўленне пра архітэктуру мінулага даюць будынкі, што захаваліся з тых часоў на плошчы Свабоды, на вуліцах Бакуніна, Герцэна, Астроўскага, Рэвалюцыйнай, Інтэрнацыянальнай і іншых. Але ўсё гэта яшчэ не дае нам поўнай карціны ранейшага горада. І вось тут на дапамогу прыйдуць старыя паштоўкі канца XIX — пачатку XX стагоддзя.

Першыя не ілюстраваныя паштоўкі з'явіліся на свет у 1869 годзе ў Аўстра-Венгрыі. У Расіі яны ўпершыню былі выдадзены ў 1872 годзе і, вядома, распаўсюдзіліся таксама на тэрыторыі Беларусі.

З развіццём фатаграфіі і друкарскай тэхнікі, з пашырэннем чыгунак і значным павелічэннем колькасці турыстаў у канцы XIX стагоддзя асаблівую папулярнасць набылі ілюстраваныя паштоўкі з відамі маляўнічых пейзажаў, гістарычных мясцін, гарадоў. Да пачатку XX стагоддзя яны друкаваліся ўжо амаль ва ўсіх краінах свету. На тэрыторыі Расійскай імперыі першыя ілюстраваныя паштоўкі пачалі выдавацца з 1894—1896 гадоў. Яны знаёмілі з краявідамі Рыжскага ўзмор'я, гарадамі Масквой, Дэрптам (цяпер Тарту)[1], Кіевам, Мінскам і інш. Дата выпуску на іх звычайна не ставілася (за выключэннем некаторых выдавецкіх фірмаў), таму арыентавацца даводзіцца пераважна па паштовых штэмпелях. Так, мною знойдзена адна паштоўка з відам гарадскога тэатра ў Мінску. На ёй стаіць штэмпель з датай адпраўкі з Мінска — 20 сакавіка 1899 года. Ві-

[1] У дужках даюцца сучасныя назвы гарадоў і вуліц.

даць, яна якраз і з'яўляецца адной з першых мінскіх ілюстраваных паштовак.

З канца XIX стагоддзя і да 1918 года паштовыя карткі з відамі Мінска выдаваліся прыватнымі выдавецтвамі. Яны выходзілі серыямі — па некалькі дзесяткаў сюжэтаў. Але тыражы іх былі невялікімі. Звычайна кожная паштоўка мела свой парадкавы нумар, з выхадам новых выданняў той ці іншай серыі нумарацыя павялічвалася. Подпісы на іх былі на рускай, французскай, польскай, нямецкай, англійскай мовах (часта на некалькіх адразу). Выданне мінскіх відаў з подпісамі на беларускай мове ў тыя часы не практыкавалася.

Мінскія паштоўкі друкаваліся са здымкаў мясцовых фатографаў, якія мелі дазвол на ўвекавечанне відаў свайго горада і яго наваколля. У пачатку XX стагоддзя іх можна было купіць не толькі ў кнігарнях і кіёсках, але і непасрэдна ў фатаграфічных майстэрнях. Тады выпускалася фотапапера памерам з паштоўку з нанесенымі лініямі для адраса, на ёй было адзначана месца для пісьма і для маркі. Прадавалася нават гатовая папера з надпісам «Открытое письмо». Калі ж такога надпісу не было, то некаторыя фатографы самі яго наддрукоўвалі на адваротным баку здымка. Такім чынам ён станавіўся фотапаштоўкай. Заставалася толькі наклеіць марку і напісаць адрас.

Калекцыі старых паштовак данеслі да нас самыя разнастайныя сюжэты. Фатографы імкнуліся адлюстраваць не толькі архітэктуру, але і паўсядзённае жыццё, этнаграфічнае аблічча горада. На картках можна ўбачыць мінчан самага рознага саслоўя, апранутых па модзе пачатку нашага стагоддзя. Перад намі конка і сялянскі воз, «дыліжанс» рамізніка і першы аўтамабіль. Дакументальна зафіксаваны выгляд як вуліц, так і асобных будынкаў. Гэта і помнікі культавай архітэктуры, і заводы, гімназіі, установы, якіх ужо даўно няма. Таму старыя мінскія паштоўкі сёння сталі каштоўнымі дакументамі па гісторыі горада, асабліва калі ўлічыць тую акалічнасць, што іншага тагачаснага ілюстрацыйнага матэрыялу амаль няма (выключэнне складаюць альбом «Виды города Минска», выдадзены ў 1904 годзе, і некалькі здымкаў з «Памятной книжки Минской губернии»). Старыя паштоўкі, што калісьці з'яўляліся сувенірамі для турыстаў і сродкам сувязі, траплялі не толькі ў розныя куткі Беларусі, але і далёка за яе межы. Дзякуючы гэтаму яны захаваліся ў сямейных

архівах, фондах музеяў і бібліятэк, зборах калекцыянераў і змаглі дайсці да нашага часу.

Калі сабраць калекцыю ўсіх мінскіх паштовак, выдадзеных у канцы XIX і пачатку XX стагоддзя, то гэта будзе своеасаблівая энцыклапедыя гістарычнага мінулага нашага горада. Старыя паштоўкі даюць магчымасць уявіць асяроддзе тых часоў, калі жылі і тварылі Янка Лучына і Карусь Каганец, Максім Багдановіч і Уладзіслаў Галубок, Янка Купала і Якуб Колас.

З развіццём капіталізму і пераходам да апошняй яго стадыі — імперыялізму Мінск стаў буйнейшым прамысловым і гандлёвым цэнтрам тагачаснай Беларусі. Гэтаму садзейнічала тое, што горад быў важным чыгуначным вузлом. Шырылася будаўніцтва заводаў і фабрык. Праўда, гэта былі дробныя і сярэднія прадпрыемствы з дзесяткам або некалькімі дзесяткамі рабочых.

Асабліва інтэнсіўна вялася забудова цэнтральных вуліц. Узводзіліся цагляныя даходныя дамы, за вялікую плату іх здавалі пад жыллё або ў арэнду розным установам. Архітэктурнае аблічча Мінска таго часу фарміравалі ў асноўным двух- і трохпавярховыя дамы, пабудаваныя эклектычна, у розных псеўдастылях або ў стылі «мадэрн». У цэнтры жылі заможныя гараджане — гандляры, чыноўнікі. Вуліцы тут былі брукаваныя, мелі дашчаты, цагляны або асфальтавы тратуар і нават асвятляліся (спачатку газавымі, а з 1895 года электрычнымі ліхтарамі).

Галоўнай і самай доўгай вуліцай тагачаснага Мінска з'яўлялася Захар'еўская (Ленінскі праспект). Ад свайго пачатку і амаль да Свіслачы яна была забудавана двух- або трохпавярховымі камяніцамі, далей жа ішлі невялікія драўляныя хаціны. Першыя паверхі дамоў у цэнтральнай частцы гэтай вуліцы займалі крамы, аптэкі, фатаграфіі, майстэрні, розныя ўстановы з мноствам рознакаляровых шыльдаў над дзвярыма, вокнамі і нават на ажурных жалезных балконччыках. На гэтай вуліцы быў «нямы» кінатэатр «Эдэн». Тут жа знаходзіліся гасцініцы: «Нова-Маскоўская», «Брусель», «Вікторыя», «Раяль», «Лібава» і іншыя. Яны былі невялікія. Самая малая з іх, «Вена», мела толькі пяць, а самая вялікая, «Адэса»,— 39 нумароў.

Асабліва ажыўленай вуліцай з'яўлялася Губернатарская. Яна звязвала галоўную вуліцу з адміністрацыйным і грамадскім цэнтрам тагачаснага Мінска — Саборнай плошчай (пл. Свабоды). Тут размяшчаліся паштова-тэлеграфная кантора, мужчынская гімназія, кіна-

тэатр «Мадэрн», а таксама гасцініцы «Маскоўская», «Швейцарыя», «Гранд гатэль» і «Еўропа» — самы высокі будынак у Мінску. Першы паверх яго займалі магазіны, астатнія пяць — гасцініца. Шосты паверх быў надбудаваны ў выглядзе мансардаў. Як гаварылася ў мясцовай рэкламе 1914 года, «Еўропа» лічылася самай вялікай гасцініцай ва ўсім Паўночна-Заходнім краі.

Мнагалюдна было заўсёды на Саборнай плошчы. На ёй знаходзіліся Губернская ўправа, дом губернатара, Азоўска-Данскі і Руска-Азіяцкі камерцыйныя банкі, Казённая палата, Акруговы суд, мноства розных крам.

Акрамя названых вышэй цэнтральнымі вуліцамі горада ў той час лічыліся таксама — Падгорная (К. Маркса), Петрапаўлаўская (Ф. Энгельса), Праабражэнская (Інтэрнацыянальная), Багадзельная (Камсамольская) і іншыя — усяго 13 вуліц. Яны таксама былі брукаваныя, мелі тратуары, а вечарамі асвятляліся. Забудоўваць іх дазвалялася толькі муравамі будынкамі.

Інакш выглядалі ўскраінныя вуліцы. Вясной і восенню яны мелі далёка не гарадскі выгляд, танулі ў гразі і вадзе, нельга было ні прайсці, ні праехаць — асабліва на Ляхаўцы і Камароўцы. Тут жыла бедната, мінскі пралетарыят. Менавіта таму амаль што не выдаваліся і паштоўкі з відамі гарадскіх ускраін.

Асноўным грамадскім транспартам у тагачасным Мінску была звычайная фурманка. У 1892 годзе па вуліцах горада праляглі рэйкі конна-чыгуначнай дарогі і пушчаны першы мінскі «трамвай» — так званая конка. Адна яе лінія пачыналася ад Брэсцкага вакзала і праходзіла па Маскоўскай, Захар'еўскай і Губернатарскай вуліцах да Саборнай плошчы. Другая ішла ад Віленскага вакзала па Каломенскай вуліцы (Свярдлова) да Акруговага суда на той жа Саборнай плошчы. Трэцяя вяла ад Акруговага суда па вуліцы Маламанастырскай (Бакуніна) — уніз да Ніжняга рынка і адтуль па вуліцы Аляксандраўскай (М. Горкага) да піваварнага завода «Багемія» (піўзавод «Беларусь»). Вагон конкі быў невялікі — у яго ўмяшчалася ўсяго 30 чалавек. Пярэдняя і задняя пляцоўкі вагона былі адкрытыя, на іх адводзіліся стаячыя месцы для фурмана і беднай публікі. Праезд на адкрытых пляцоўках каштаваў менш, чым у салоне, але зімой і восенню там даймалі мароз і вецер.

«Легкавымі таксі» з'яўляліся фурманкі рамізнікаў, якія зімой змяняліся на вазкі (сані). «Грузавым таксі» для падвозкі мэблі ці

дроў служылі ламавыя рамізнікі. З «тэхнікі» спачатку з'явіліся веласіпеды, а з 1912 года — першыя аўтатаксі.

Месцам адпачынку мінчан служыў гарадскі сад (парк імя М. Горкага), засаджаны ліставымі і хваёвымі дрэвамі. У садзе знаходзіліся летні тэатр і велатрэк Мінскага таварыства веласіпедыстаў — першае спартыўнае збудаванне горада. Любімым месцам прагулак быў Аляксандраўскі сквер (Цэнтральны сквер, што ля тэатра імя Янкі Купалы). Пасярэдзіне яго красаваўся басейн з фантанам, які можна пабачыць і сёння. Гарадскі сад і Аляксандраўскі сквер былі абгароджаны плотам. Адпачывала тут толькі багатая публіка.

Характэрны сілуэт Мінску прыдавалі пірамідальныя тапалі. Імі былі абсаджаны вуліцы Падгорная (К. Маркса) і Скобелеўская (Чырвонаармейская). У XIX стагоддзі яны раслі і на Саборнай плошчы — ля ратушы, аб чым сведчаць малюнкі тагачасных беларускіх мастакоў Н. Орды, І. Герасімовіча і іншых. Але на паштоўках тапаляў ужо не відаць. На іх месцы з'явіўся Саборны сквер, засаджаны ў другой палавіне XIX стагоддзя іншымі пародамі дрэў. Ён захаваўся да нашага часу.

Даўно адышла ў мінулае, стала гісторыяй эпоха газавага ліхтара і гужавога транспарту. Ушыркі і ўверх вырас былы губернскі горад, а сёння сталіца Савецкай Беларусі — адзін з буйнейшых прамысловых, навуковых, культурных і адміністрацыйных цэнтраў нашай краіны. Не пазнаць былой Захар'еўскай вуліцы — Ленінскага праспекта. На ім пабудаваны шматпавярховыя дамы, дзе атрымалі добраўпарадкаваныя кватэры працоўныя Мінска. Далёка за былой мяжой горада ўзняліся 9—16-павярховыя гмахі новых мікраранаў «Серабранка», «Усход», «Зялёны Луг» і іншых. «Небаскробам» Мінска цяпер можна лічыць не гасцініцу «Еўропа», а будынак з бетону і шкла на Юбілейнай плошчы. Не параўнаць з той жа «Еўропай» сучасную трынаццаціпавярховую гасцініцу «Юбілейная» ці пятнаццаціпавярховую «Турыст». Па-іншаму выглядаюць прасторныя, шырокія, заасфальтаваныя мінскія вуліцы. Па іх імчаць сотні легкавых аўтамабіляў, камфартабельных аўтобусаў, трамваяў, тралейбусаў. Да 40-годдзя вызвалення Беларусі ў Мінску ўступіла ў строй метро. З любоўю адносяцца мінчане да архітэктурнай спадчыны мінулага. Старыя будынкі рэстаўрыруюцца і працягваюць служыць людзям, прываблiваюць позіркі гасцей і турыстаў.



# 1

Віленскі вакзал. 1907 г.
Вакзал Лібава-Роменскай чыгункі быў
пабудаваны ў мінулым стагоддзі.
У кастрычніку 1905 года тут па загаду
губернатара Курлова быў расстраляны
мітынг чыгуначнікаў і працоўных Мінска.
25 кастрычніка 1917 года, у дзень перамогі
пралетарскай рэвалюцыі, на Прывакзальнай
плошчы перад працоўнымі горада і салдатамі,
што сабраліся, каб падтрымаць Кастрычніцкую
рэвалюцыю і Савецкую ўладу, выступілі
А. Ф. Мяснікоў і К. І. Ландар



2

Перон Віленскага вакзала. 1907 г.




3

Пераезд Лібава-Роменскай чыгункі. 1902 г.
Цяпер гэты чыгуначны мост раздзяляе
вуліцы Маскоўскую і Мяснікова




# 4

Брэсцкі вакзал
Маскоўска-Брэсцкай чыгункі. 1912 г.
Драўляны будынак вакзала быў пабудаваны
ў 1871 годзе. Згарэў у часы белапольскай
інтэрвенцыі. На яго месцы стаіць будынак
Першай станцыі сігналізацыі і сувязі
Беларускай чыгункі






# 5

Саборная плошча (дом губернатара,
езуіцкі касцёл, Казённая палата).
Саборная плошча (пл. Свабоды) — старажытны цэнтр Мінска (так званы Верхні горад). З паўднёва-заходняга боку ў XVII—XVIII стагоддзях яна была забудавана архітэктурным комплексам езуіцкага кляштара, куды ўваходзілі касцёл у стылі барока і калегіум з гадзіннікавай вежай. У XIX стагоддзі адзін будынак калегіума адышоў пад Казённую палату, а другі (злева ад касцёла) — пад дом губернатара




6

Казённая палата. 1917 г.
Адзін з будынкаў езуіцкага калегіума.
Узведзены ў XVIII стагоддзі.
Двойчы перабудоўваўся




# 7

Саборная плошча.
У другім будынку справа, верагодна,
працаваў тэатр. Цяпер на гэтым месцы
пачынаецца мост, які злучае плошчу
Свабоды з праспектам Машэрава




# 8

Азоўска-Данскі камерцыйны банк і купецкі клуб. Помнік архітэктуры XVII стагоддзя. Перабудаваны ў канцы XIX стагоддзя ў стылі мадэрн. У 1917 годзе тут знаходзіўся выканаўчы камітэт Заходняга фронту. Будынак захаваўся (пл. Свабоды, 4)




# 9

**Акруговы суд.**
**Будынак былога базыліянскага мужчынскага кляштара. Пабудаваны ў XVII—XVIII, рэканструяваны ў XIX стагоддзях.**
**Тут, у Акруговым судзе, 15 верасня 1908 года царскія ўлады судзілі Якуба Коласа за ўдзел у нелегальным настаўніцкім з'ездзе.**
**Пасля рэвалюцыі — Дом працы, дзе ў 1924 г. М. І. Калінін сустракаўся з дэлегацыяй беларускіх сялян. Цяпер — будынак Белсаўпрофа**






# 10

Саборная плошча і кляштар.
Цяпер пло́шча Свабоды
(ля пачатку вул. Бакуніна).
На заднім плане —
касцёл бернардзінцаў (XVII ст.)




# 11

Верхні рынак. 1918 г.
Справа — касцёл бернардзінцаў і гандлёвыя рады. Будынкі захаваліся (акрамя тых, што былі з левага боку)




# 12

Саборная плошча з відам на гарадскі сквер
(закладзены ў XIX стагоддзі).
Цяпер — у цэнтры плошча Свабоды




# 13

На рагу Саборнай плошчы
і Губернатарскай вуліцы.
Злева — трохпавярховая гасцініца
«Еўропа» (да перабудовы)




14

Гасцініца «Еўропа».
Разбурана ў час Вялікай Айчыннай вайны


СѢВЕРНЫЙ БАН




# 15

Так выглядала Інтэрнацыянальная вуліца ў раёне плошчы Свабоды. Другі будынак справа — Руска-Азіяцкі банк. За ім — перабудаваны дом, у якім у сярэдзіне мінулага стагоддзя знаходзіўся гарадскі тэатр





14 Минскъ - Рѣка Свислочь, мостъ, монастырь и соборъ.

# 16

Свіслач у раёне Ніжняга рынку.
Злева — старыя будынкі Траецкага прадмесця,
справа — адхон Мінскага замчышча




# 17

Гандлёвыя рады на Ніжнім рынку.
Гэта адна са старажытных мясцін горада —
раён Мінскага замчышча. Цяпер тут сходзіцца
вуліца М. Горкага з праспектам Машэрава
і ўпадае ў Свіслач рэчка Няміга
(плошча 8 Сакавіка)



# 18

Шпалерная фабрыка, заснаваная ў 1881 годзе
на Нова-Маскоўскай вуліцы. Каля яе
працякала Няміга. (На фота зафіксавана як
канал з перакіднымі мосцікамі).
На месцы былой фабрыкі цяпер абутковае
вытворчае аб'яднанне «Прамень»






# 19

Нова-Маскоўская вуліца.
Цяпер раён вуліцы Нямігі


ИНЪ




# 20

**Губернатарская вуліца. 1907 г.
Так яна выглядала з боку Саборнай плошчы
(пл. Свабоды) да вуліцы Захар'еўскай
(Ленінскі праспект)**

3 Зак. 750

улица.






# 21

Губернатарская вуліца. 1907 г.
Від ад Захар'еўскай вуліцы
ў бок Саборнай плошчы




# 22

Від на Губернатарскую вуліцу. 1907 г.




23

Губернатарская вуліца. 1918 г.
Від у бок Саборнай плошчы




24

Мужчынская гімназія на Губернатарскай вуліцы.
Будынак узведзены ў пачатку XX стагоддзя.
Да вайны ў ім была 2-я гарадская школа
(на месцы цяперашняга сквера каля
скрыжавання вуліц Леніна і К. Маркса)



# 25

Перакрыжаванне вуліц Губернатарскай
і Захар'еўскай. Від у бок Саборнай плошчы






# 26

Від Губернатарскай вуліцы ад сада гімназіі (справа) у бок Саборнай плошчы





# 27

Від паштова-тэлеграфнай канторы ад вуліцы
Падгорнай (К. Маркса) у бок Захар'еўскай




# 28

**Чыгуначная царква і капліца...**
**Адсюль пачыналася Захар'еўская вуліца**
**(Ленінскі праспект).**
**Тут стаяла каменная капліца.**
**Цяпер на гэтым месцы сходзяцца вуліцы**
**Савецкая, Мяснікова і Бабруйская.**
**За капліцай стаяла невялічкая царква,**
**узведзеная для чыгуначнікаў у 1890 г.**
**Абодва будынкі не захаваліся**



29

**Захар'еўская вуліца. 1910 г.**
**Будынкі не захаваліся. На іх месцы цяпер знаходзіцца Галоўпаштамт**


ВОСХОДЪ




# 30

Захар'еўская вуліца.
Так у пачатку нашага стагоддзя выглядаў
сучасны Ленінскі праспект на ўчастку
ад вуліцы Валадарскага да Камсамольскай.
Першы будынак злева — гасцініца «Лібава»,
справа — двухпавярховы будынак гасцініцы
«Вікторыя», а за ёю — гасцініца «Гарні»




# 31

Конка. 1918 г.
Яна з'явілася на вуліцах горада ў 1892 г.
У 1929 г. яе змяніў электрычны трамвай




# 32

Захар'еўская вуліца. 1917 г.
Першы будынак справа — кінатэатр «Новы тэатр» (цяпер прыкладна на гэтым месцы — Цэнтральны кніжны магазін, што на рагу Ленінскага праспекта і вуліцы Камсамольскай). Далей — трохпавярховы будынак Польскага банка (на яго месцы цяпер клуб Ф. Э. Дзяржынскага)






33

Захар'еўская вуліца. 1917 г.
Справа — трохпавярховы будынак Мінскага сельскагаспадарчага таварыства. Цяпер на яго месцы знаходзіцца кінатэатр «Цэнтральны»

# 34

Гасцініца «Адэса».
Яна знаходзілася
на вуліцы Захар'еўскай, 61.
Цяпер гэта рог вуліцы
Камсамольскай і Ленінскага
праспекта (там, дзе
Цэнтральны
кніжны магазін)






35

Гасцініца «Гарні».
Стаяла на рагу сучасных
вуліц Камсамольскай
і Ленінскага праспекта
(цяпер у пабудаваным
на гэтым месцы доме
знаходзіцца гастраном)






# 36

Захар'еўская вуліца.
Від ад сучаснай Камсамольскай вуліцы
да вуліцы Леніна. Будынкі не захаваліся

# 37

Губернская земская ўправа. 1910 г.
Гэты будынак знаходзіўся на Захар'еўскай вуліцы, 69. У ім у 1916—1917 гадах працаваў Максім Багдановіч. Цяпер на гэтым месцы знаходзіцца магазін «Паўлінка», дакладней, тратуар перад магазінам, бо вуліцу пасля вайны значна пашырылі


МИНСКЪ. Губернская Земская Управа
MIŃSK. Zarząd Gubernialny Ziemski




38

Сельскагаспадарчае
т-ва «Серп»
на Захар'еўскай вуліцы




# 39

Захар'еўская вуліца.
На пярэднім плане — кніжны і нотны магазіны




## 40

Нова-Маскоўская гасцініца на рагу Захар'еўскай і Губернатарскай вуліц. Цяпер прыкладна на гэтым месцы стаіць будынак Дзяржаўнага банка


ЭЛЕКТРО-ТЕАТРЪ
ЭДЕНЪ
ПРОГРАММА
EDEN
DAMSKI
OROW
ДАМСКIЙ
ПОРТНОЙ
ВОЕННЫЙ и ГРАЖДАН
ПОРТНОЙ




# 41

Захар'еўская вуліца (гандлёвая яе частка).
На паштоўцы — «электратэатр»
«нямога» кіно «Эдэн»
(цяпер тут магазін «Універсам»)




# 42

**Гасцініца «Парыж».**
**Знаходзілася на рагу цяперашніх Ленінскага праспекта і вуліцы Энгельса. 25 і 27 чэрвеня 1911 года ў зале гасцініцы адбыўся спектакль па п'есе Каруся Каганца «Модны шляхцюк». Гэта было першае ў Мінску тэатральнае выступленне славутай беларускай трупы пад кіраўніцтвам Ігната Буйніцкага**




# 43

Захар'еўская вуліца, рог Скобелеўскай (Чырвонаармейскай).
Злева відаць частка будынка, які належаў да Архірэйскага падвор'я. Цяпер у ім музей Беларускай ваеннай акругі. Далей — Аляксандраўскі сквер. Дамы з правага боку не захаваліся, на іх месцы — Цэнтральная плошча




44

Від Захар'еўскай вуліцы на яе скрыжаванні
з вуліцай Петрапаўлаўскай (Ф. Энгельса)




# 45

**Уваход у Аляксандраўскі сквер.
Сквер быў закладзены ў 1872 годзе
(Цэнтральны сквер ля тэатра імя Янкі Купалы).
У ім стаяла каплічка, пабудаваная ў 1869 г.
Ля яго ўвахода ў 1912 годзе знаходзілася
стаянка першага ў Мінску аўтатаксі**

5 Зак. 750





46

Бульвар (у Аляксандраўскім скверы).
Фантан, які можна ўбачыць і сёння




# 47

Захар'еўская вуліца.
Злева відаць будынак рэальнага вучылішча, заснаванага ў 1880 годзе. Знаходзіўся непадалёку ад перакрыжавання з Паліцэйскай вуліцай (Янкі Купалы). У канцы мінулага стагоддзя дырэктарам вучылішча быў І. І. Самойла, бацька беларускага публіцыста і літаратурнага крытыка Уладзіміра Іванавіча Самойлы, які рыхтаваў Янку Купалу да паступлення ў гэта вучылішча, а потым дапамог яму надрукаваць у газеце «Северо-Западный край» першы верш «Мужык»



# 48

Від на рэальнае вучылішча
і Захар'еўскую вуліцу з боку
Паліцэйскай вуліцы (Я. Купалы)






# 49

**Гарадскі сад, заснаваны ў 1796—1806 гадах.**
**Цяпер Цэнтральны дзіцячы парк імя М. Горкага**



50

У летнім тэатры гарадскога сада
з 80-х гадоў XIX стагоддзя да пабудовы
памяшкання гарадскога тэатра летам і восенню
адбываліся розныя канцэрты і спектаклі
мясцовых і вандроўных труп



51

Велатрэк Мінскага таварыства
веласіпедыстаў-аматараў
знаходзіўся ў гарадскім садзе.
У 1920 годзе тут ставіўся спектакль
Льва Літвінава «Праца і капітал»




52

Галоўная алея трэка



53

Гарадскі сад



54

«Алея кахання» ў гарадскім садзе



55

Рака Свіслач і гарадскі сад






56

Гарадскі тэатр (тэатр імя Янкі Купалы),
пабудаваны ў 1890 годзе
(архітэктар К. Казлоўскі).
2 і 3 лютага 1919 года ў яго будынку праходзіў
I Усебеларускі з'езд Саветаў, які прыняў
першую Канстытуцыю БССР, на ім выступаў
Я. М. Свярдлоў. З 1920 года —
першы Беларускі дзяржаўны тэатр




# 57

Петрапаўлаўская вуліца.
На паштоўцы відаць будынак Дваранскага дэпутацкага сходу, пабудаваны ў 1860-я гады. Цяпер на яго месцы стаіць дом з магазінам «Саюздрук» (на першым паверсе).
З 1864 года ў гэтым будынку даваліся тэатральныя прадстаўленні, наладжваліся выстаўкі садаводства і кветаводства.
У 20-я і 30-я гады — Дом камуністычнага выхавання імя К. Маркса. У ім адбываліся літаратурныя вечары, на якіх бывалі Янка Купала, Якуб Колас, Цішка Гартны і іншыя



# 58

Петрапаўлаўская вуліца.
Так выглядала цяперашняя вуліца Ф. Энгельса
ля яе скрыжавання з Ленінскім праспектам

6 Зак. 750

59

Петрапаўлаўская вуліца.
На другім плане —
дамініканскі кляштар
XVII—XVIII стагоддзяў,
які стаяў на рагу вуліц
Петрапаўлаўскай
(Ф. Энгельса)
і Храшчэнскай [1]
(Інтэрнацыянальная).
На месцы гэтых будынкаў
сёння сквер
(за Цэнтральнай плошчай)




[1] Праабражэнская вуліца (Інтэрнацыянальная) пачыналася ад цяперашняй Рэспубліканскай і ішла да Петрапаўлаўскай (Ф. Энгельса), а далей мела назву Храшчэнская.




# 60

Упраўленне Лібава-Роменскай чыгункі. Будынак узведзены ў стылі мадэрн па вуліцы Серпухаўскай у пачатку XX стагоддзя. Ен захаваўся (цяпер тут, на скрыжаванні вуліц Кірава і Валадарскага, знаходзіцца кафэ «Мядуха»). Ва ўпраўленні Лібава-Роменскай чыгункі, калі яно знаходзілася на Захар'еўскай вуліцы, 72, у 1885—1897 гадах працаваў Янка Лучына






# 61

Петрапаўлаўская вуліца.
Такой была ў пачатку нашага стагоддзя
цяперашняя вуліца Ф. Энгельса на ўчастку
ад Інтэрнацыянальнай да Ленінскага праспекта

62

Акварыум.
Тэатр-вар'етэ і рэстаран «Акварыум» знаходзіліся на вуліцы Юр'еўскай, у доме № 17.
У 1920 годзе ў гэтым будынку працаваў беларускі тэатр пад кіраўніцтвам Уладзіслава Галубка.
Пазней тут быў беларускі рабочы клуб, у якім у час прыезду ў Мінск выступаў У. Маякоўскі[1]




[1] Вуліца Юр'еўская пралягала паміж Захар'еўскай і Храшчэнскай.




## 63

Будынак Чырвонага Крыжа на рагу вуліц
Падгорнай (К. Маркса) і Каломенскай (Свярдлова).
Тут дзейнічала школа сясцёр міласэрнасці,
стаялі карэты хуткай дапамогі






# 64

Падгорная вуліца.
Цяпер гэта скрыжаванне вуліц К. Маркса
і Валадарскага. У першым доме справа
ў даваенны час быў дабудаваны трэці паверх.
Другі трохпавярховы будынак захаваўся
ў першапачатковым выглядзе




65

**Аддзяленне Дзяржаўнага банка на Падгорнай вуліцы. У 30-я гады будынак перароблены. Цяпер тут знаходзіцца Дзяржаўны музей БССР**




66

Першае чатырохкласнае гарадское вучылішча, якое знаходзілася на Падгорнай вуліцы (у раёне цяперашняга Дома архітэктараў)




67

**Жаночая Марыінская гімназія.
Будынак не захаваўся. Знаходзіўся
на цяперашняй вуліцы К. Маркса
ў раёне Вышэйшай партыйнай школы**




68

**Падгорная вуліца.**
**Так выглядала цяперашняя вуліца К. Маркса**
**на ўчастку ад вуліцы Ф. Энгельса**
**да вуліцы Леніна**






# 69

**Від будынка Дваранскага сходу з боку Скобелеўскай (Чырвонаармейскай) вуліцы**




70

**У гэтым будынку знаходзіўся Грамадскі сход (клуб), а пазней вайсковы шпіталь. Ен стаяў на рагу цяперашніх вуліц К. Маркса і Чырвонаармейскай (насупраць будынка ЦК ЛКСМ Беларусі)**




# 71

Дэпутацкі сход (клуб).
Від на Падгорную вуліцу
з боку Петрапаўлаўскай у напрамку
да Губернатарскай вуліцы



72

Спуск у гарадскі сад.
Сёння тут вуліца К. Маркса на скрыжаванні
з Чырвонаармейскай. Далей ідзе спуск
да вуліцы Я. Купалы. На месцы драўляных
хацінак стаіць будынак ЦК ЛКСМ Беларусі




# 73

Земскі музей.
Ен знаходзіўся на рагу вуліц Скобелеўскай і Падгорнай і ўваходзіў у архітэктурны комплекс Архірэйскага падвор'я. Цяпер на месцы музея стаіць помнік-танк




74

Вуліца Скобелеўская ад Падгорнай да Захар'еўскай. Злева — Аляксандраўскі сквер, справа — Земскі музей, агароджа Архірэйскага падвор'я. 1917 г.



75

Паліцэйская вуліца.
Так у пачатку XX стагоддзя выглядала
цяперашняя вуліца Янкі Купалы






# 76

Праабражэнская вуліца.
Так выглядала сучасная Інтэрнацыянальная
вуліца ў пачатку стагоддзя.
Злева — гасцініца «Мачыз». Будынкі часткова
захаваліся (некаторыя з дабудаванымі паверхамі)

# 77

Даходны дом багатага мінчаніна Ахмеда Офлі. Будынак захаваўся (Я. Купалы, 5). Цяпер тут праўленне грамадскага харчавання






78

Від правага боку Праабражэнскай вуліцы ад Багадзельнай (Камсамольскай) у напрамку Саборнай плошчы. На месцы крайняга справа будынка цяпер стаіць кінатэатр «Перамога». Далей цагляны плот і купал Праабражэнскага кляштара (адсюль і назва вуліцы)




# 79

**Міністэрская гімназія.**
**Гэта жаночая гімназія знаходзілася**
**на Праабражэнскай вуліцы. Цяпер гэта раён**
**скрыжавання вуліц Інтэрнацыянальнай**
**і Урыцкага**



80

**Багадзельная вуліца і прагімназія. 1915 г.**
**Так выглядала цяперашняя Камсамольская вуліца ад Ленінскага праспекта да Інтэрнацыянальнай. Будынкі не захаваліся**






81

Літаратурна-артыстычнае таварыства.
У першым справа будынку на рагу Захар'еўскага завулка і Падгорнай вуліцы ў 1898 годзе была заснавана прагрэсіўная культурна-асветніцкая арганізацыя «Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў».
У 1906 г. за сваю актыўную рэвалюцыйную дзейнасць было закрыта. Замест яго тут пачало працаваць «Літаратурна-артыстычнае таварыства», якое лекцыямі прапагандавала рэвалюцыйныя і дэмакратычныя ідэі ў літаратуры і мастацтве.
Цяпер гэта дом № 17 на вуліцы К. Маркса




82

Камерцыйнае вучылішча. 1907 г.
Яно знаходзілася ў Васільеўскім завулку
(у раёне цяперашняй Прывакзальнай плошчы).
Будынак і вуліца не захаваліся




# 83

Серпухаўская вуліца і рэальнае вучылішча.
Так выглядала ў пачатку XX стагоддзя
цяперашняя вуліца Валадарскага

# 84

Серпухаўская вуліца
(Валадарскага)



18 Минскъ - Серпуховская улица.




# 85

Прыватная гімназія
Е. Д. Рэймана.
Будынак захаваўся,
знаходзіцца на рагу
Міхайлаўскага завулка
і вуліцы Кірава.
У ім цяпер аддзел
народнай асветы
Мінскага гарвыканкома




86

**Шпітальная вуліца і ваенны лазарэт.**
**Цяпер вуліца імя Фрунзе.**
**Будынак былога лазарэта захаваўся**




# 87

Гімназія Фальковіча.
На скрыжаванні Скобелеўскай
і Магазіннай вуліц. Цяпер на гэтым месцы
стаіць будынак філалагічнага факультэта
Беларускага дзяржаўнага універсітэта
імя У. І. Леніна

С каждым годом растет и красивеет столица Советской Белоруссии город-герой Минск. Появляются новые улицы и проспекты, растут высотные сооружения. За более чем девятисотлетнюю историю неумолимое время, войны и пожары неоднажды меняли облик города. В годы Великой Отечественной войны Минск был почти полностью разрушен фашистскими захватчиками. Другой вид он принял в результате послевоенного восстановления. Неузнаваемо изменились бывшие окраины...

Чтобы более выразительно представить, как вырос, изменился Минск, нужно оглянуться назад. Но как же современному поколению минчан заглянуть в прошлое своего города? О многом могут рассказать исследования археологов, экспонаты музеев, мемуарные записи и воспоминания старожилов, старые гравюры и рисунки художников. Некоторое представление об архитектуре прошлого дают здания, сохранившиеся с тех времен на площади Свободы, на улицах Бакунина, Герцена, Островского, Революционной, Интернациональной и других. Но все это еще не дает нам полной картины города в прошлом. И вот здесь на помощь придут старые почтовые открытки конца XIX — начала XX века.

Первые не иллюстрированные почтовые открытки появились на свет в 1869 году в Австро-Венгрии. В России впервые они были изданы в 1872 году и, конечно, распространились также на территории Белоруссии.

С развитием фотографии и печатной техники, с распространением железных дорог и значительным увеличением количества туристов в конце XIX века особую популярность приобрели иллюстрированные почтовые открытки с видами живописных пейзажей, исторических достопримечательностей, городов. К началу XX века они печатались уже почти во всех странах мира. На территории Российской империи первые иллюстрированные почтовые открытки стали издаваться с 1894—1896 годов. Они знакомили с пейзажами Рижского взморья, городами Москвой, Дерптом (сейчас Тарту) [1], Киевом, Минском и др. Дата выпуска на них обычно не ставилась (за исключением некоторых издательских фирм), поэтому ориентироваться приходится преимущественно по почтовым штемпелям. Так, мной найде-

[1] В скобках даются современные названия городов и улиц.

